УДК 332.14

# УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЯСКОВЫХ ТЭРЫТОРЫЙ БЕЛАРУСІ: ПАТЭНЦЫЯЛ САМАРАЗВІЦЦЯ

**Сіваграказ Алег Уладзіміравіч,**
дацэнт кафедры філасофіі, сацыялогіі і эканомікі
МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ, кандыдат эканамічных навук, дацэнт,
г. Мінск, Беларусь, sivagrak@yahoo.com

**Ключавыя словы:** вясковыя тэрыторыі, устойлівае развіццё, стратэгія.
**Keywords:** rural territories, sustainable development, strategy.

**Анатацыя.** Даецца агляд дзейнасці праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Пасшырэнне эканамічных магчымасцей у вясковай Беларусі», ажыццяўляемага ўстановай «Новая Еўразія», накіраванага на падтрымку эканамічнага развіцця 18 сельсаветаў з розных рэгіёнаў краіны. Выкладзены асноўныя вынікі праведзеных у рамках праекта даследаванняў гэтых сельскіх тэрыторый.

**Abstract.** A review of the activities of international technical assistance project “Expanding Economic Opportunities in Rural Belarus” implemented by the institution “New Eurasia” aimed at supporting economic development of 18 rural territories from various regions of the country. The basic results of the project research of the rural areas are reflected.

Установа “Новая Еўразія” рэалізуе ў Беларусі (2015–2017 гг.) праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі “Пашырэнне эканамічных магчымасцей у вясковай Беларусі”, накіраваны на эканамічнае развіццё сельскіх рэгіёнаў. Мэтай праекта, што фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і Фондам “Еўразія” (за кошт сродкаў Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці – USAID), з’яўляецца павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва праз пашырэнне эканамічных магчымасцей на асобных вясковых тэрыторыях Беларусі. Праект накіраваны на ўцягванне ў партнёрства мясцовых органаў улады і кіравання, некамерцыйных арганізацый і ініцыятыў грамадзян, а таксама бізнесу дзеля ўзмацнення гаспадарчай актыўнасці ў вясковай мясцовасці. Пры падтрымцы праекта ажыццяўляецца пашырэнне эканамічнай інфраструктуры ў праектных тэрыторыях, навучанне і прадастаўленне кансультацый мясцовым жыхарам па перспектыўным бізнес-мадэлям, а таксама ўмацаванне патэнцыялу мясцовых некамерцыйных арганізацый і ініцыятыў грамадзян, якія садзейнічаюць эканамічнаму развіццю.

Дванаццаць сельскіх тэрыторый, у склад якіх уваходзяць 18 сельсаветаў, у розных рэгіёнах Беларусі, дзе праходзяць мерапрыемствы праекта, адабраныя незалежнай камісіяй на аснове адкрытага конкурсу ва ўмовах вострай канкурэнцыі (усяго на конкурс было пададзена 60 заявак). Гэта тэрыторыі Дзераўноўскага сельсавета Слонімскага раёна,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Спораўскага сельсавета Бярозаўскага раёна, Крывасельскага – Вілейскага раёна, Валожынскага і Пяршайскага – Валожынскага раёна, Чамярыскага – Брагінскага раёна, Судкоўскага і Барысаўшчанскага – Хойніцкага раёна, Жалудоцкага і Орлеўскага – Шчучынскага раёна, Крэўскага і Залескага – Смаргонскага раёна, Бабініцкага і Мазалаўскага – Віцебскага раёна, Хадасоўскага – Мсціслаўскага раёна, Відамлянскага – Камянецкага раёна і Чарнаўчыцкага – Брэсцкага раёна, Мотальскага – Іванаўскага раёна. Пасля рэалізацыі праекта яны стануць дэманстрацыйнымі пляцоўкамі па ўстойлівым развіцці, а іх вопыт будзе распаўсюджаны па ўсёй Беларусі.

На першым этапе рэалізацыі праекта праведзены 12 даследаванняў сацыяльна-эканамічнага і прыроднага стану праектных тэрыторый, а таксама аналіз чалавечага і інстытуцыйнага патэнцыялу.

На другім этапе праекта для мясцовых органаў улады і кіравання, прадстаўнікоў грамадскасці арганізаваны сесіі па распрацоўцы стратэгій устойлівага развіцця. У праектных тэрыторыях адкрыты 13 рэсурсных цэнтраў эканамічнага развіцця.

У рамках праекта зацікаўленыя асобы прымаюць удзел у тэматычных трэнінгах і атрымліваюць кансультацыі па арганізацыйнаму развіццю некамерцыйных арганізацый, асаблівасцях падаткаабкладання, стварэнню кааператываў, вядзенню сямейнага бізнесу і сельскага турызму, ім аказваецца дапамога ў бізнес-планаванні і маркетынгу. Таксама ўдзельнікі праекта пазнаёміліся з лепшымі замежнымі і беларускімі практыкамі мясцовага эканамічнага развіцця падчас чатырох азнаямленчых візітаў як у Беларусі, так і за мяжу.

На трэцім этапе праекта ў ліпені 2016 г. 12 найбольш перспектыўных сумесных ініцыятыў, якія спрыяюць эканамічнаму развіццю праектных тэрыторый, адабраныя на конкурснай аснове і атрымліваюць фінансавую падтрымку.

Сярод асноўных вынікаў праведзенных у межах праекта даследванняў пілотных вясковых сацыяльна-прыродна-эканамічных комплексаў наступныя:

– недастатковая ўвага сённяшніх даследчыкаў і навуковых структур да лакальнага ўзроўню сацыяльна-прыродна-эканамічнага развіцця – узроўню вёскі, сельсавета, малога горада;

– слабасць мясцовага самакіравання;

– шматграннасць і шматколернасць карціны сельскага жыцця і, як следства, неэфектыўнасць выкарыстання аднолькавых рэцэптаў для паляпшэння;

– эканамічныя праблемы (недахоп працоўных месцаў на вёсцы і вузкі пералік прафесій, нізкая плацежаздольнасць вясковага насельніцтва, скарачэнне маштабаў дзяржаўнай падтрымкі вёскі, праблемы збыту прадукцыі і інш.);



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– сацыяльныя праблемы (дэпапуляцыя вясковых тэррыторый, вельмі малая колькасць недзяржаўных некамерцыйных арганізацый на вёсцы, асабліва ў параўнанні з развітымі краінамі);

– праблемы навакольнага асяроддя (пагаршэнне якасці водных рэсурсаў, нізкая якасць пітной вады, дэградацыя сельскагаспадарчых зямель, невырашанасць пытанняў цвёрдых бытавых выкідаў).

Адначасова адзначаецца наяўнасць шырокіх магчымасцей, мясцовых рэсурсаў для развіцця вясковых тэрыторый, “кропкавыя” поспехі ў развіцці вясковага прадпрымальніцтва, аграэкатурызму. Вялікі патэнцыял карэніцца ў выкарыстанні мясцовых гісторыка-культурных і прыродных каштоўнасцей вясковых тэрыторый. Ёсць магчымасці ў механізмах дзяржаўна-прыватнага партёрства на вёсцы, а таксама ў развіцці новага кааператыўнага руху. Важным рэзервам вясковага развіцця з’яўляецца таксама ўмацаванне чалавечага патэнцыялу праз мэтанакіраваныя праграмы дадатковай адукацыі, навучанне праектнаму менеджменту, фандрайзінгу, развіццё лідэрскіх якасцей вясковай моладзі.

У межах праекта “Пашырэнне эканамічных магчымасцей у вясковай Беларусі” завяршаецца распрацоўка мясцовых стратэгій устойлівага развіцця. На гэтым шляху выяўлены скрытыя рэзервы, адкрыты новыя магчымасці, паўсталі свежыя ідэі для сельскага ўстойлівага развіцця. З вопытам пілотных тэрыторый будзе знаёміцца насельніцтва іншых рэгіёнаў Беларусі.

Важна, што ў мясцовых стратэгіях устойлівага развіцця адбыўся сінтэз меркаванняў мясцовых жыхароў і экспертаў у частцы ацэнкі канкурэнтных пераваг, актуальных і патэнцыяльных патрэб мясцовых супольнасцей, канкрэтных перспектыўных відаў эканамічнай і іншай дзейнасці, якія могуць спрыяць устойліваму развіццю пілотных тэрыторый. У далейшым важна добра распарадзіцца стратэгічнымі распрацоўкамі, каб на іх аснове супольнасці рабілі наступныя крокі ў кірунку ўстойлівасці: павышалі патэнцыял, развівалі партнёрства, ажыццяўлялі канкрэтныя ініцыятывы, выкарыстоўвалі магчымасці рэсурсных цэнтраў эканамічнага развіцця. Для гэтага патрэбна актывізацыя ў дадзенай вобласці ўсіх зацікаўленых: дзяржаўных органаў, мясцовай улады, бізнесу, НДА, актыўных вясковых жыхароў.

Хочацца ўбачыць таксама змены ў стаўленні дзяржавы да іміджавых пытанняў вясковага развіцця. Сёння дзяржава актыўна дэкларуе ўсялякую зацікаўленасць у тым, каб моладзь заставалася на вёсцы або ехала жыць у вёску. Пры гэтым мы не бачым сацыяльнай рэкламы прыгожага жыцця ў вёсцы, ролікаў аб тым, як добра жыць у вёсцы, не чуем гісторый поспеху асобных вёсак і вяскоўцаў. Мы бачым ўсюды чалавека з Мінска.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Адсутнасць спецыяльных праграм па прыцягненню маладых людзей у вёску таксама не спрыяе жаданню моладзі вярнуцца ў сельскую мясцовасць. Можна прывесці прыклад беларускай сям'і, якая з'ехала працаваць у Мюнхен (Нямеччына). Адзін старадаўні гарадок, размешчаны ў 150 км ад Мюнхена, вырашыў удыхнуць у сябе новае жыццё і ў сувязі з гэтым прыцягнуць моладзь. Мясцовым муніцыпалітэтам быў аб'яўлены конкурс, па ўмовах якога той, хто выйграў (маладая сям'я з не менш чым трыма дзецьмі), атрымлівае практычна бясплатна добрае месца пад забудову дома. Нейкую суму грошай атрымліваюць таксама на кожнага з дзяцей. Плюс даюць льготны крэдыт пад 2–3%. Нашы знаёмыя выйгралі гэты конкурс і пераехалі туды жыць. У нас, у Беларусі, на жаль, аб такіх праграмах пакуль казаць не прыходзіцца.

Ёсць шэраг агульных фактараў, якія перашкаджаюць вясковым тэрыторыям Беларусі паспяхова развівацца. І адным з іх, як ужо не раз адзначалася, з'яўляецца слабасць мясцовага самакіравання, цэнтралізацыя кіравання і рэсурсаў. Наўрад ці развіццё асобных вёсак, гарадоў, раёнаў і абласцей можа ажыццяўляцца з дапамогай гіперцэнтралізацыі, з якой мы маем справу ў Беларусі. У сучасным свеце карысць і эфектыўнасць дэцэнтралізацыі відавочная. У першую чаргу яна адкрывае шырокія магчымасці для актыўнага ўдзелу грамадзян у жыцці краіны. Ёсць такі прынцып ва ўстойлівым развіцці (прынцып субсідыярнасці): калі справу, праблему можна вырашыць на самым ніжэйшым узроўні, то бок, на ўзроўні аднаго чалавека (сям'і, вёскі, раёна), то так і павінна адбывацца. А "наверх" аддаваць толькі тое, з чым справіцца на ўзроўні сельсавета, горада і раёна не атрымліваецца. А то выходзіць, што мясцовыя старшыні з цяжкасцю балансуюць паміж патрэбамі і інтарэсамі тэрыторый з іх насельніцтвам і адміністрацыйным ціскам зверху. Старшыні райвыканкама важней быць лепшым у вачах старшыні аблвыканкама, чым мясцовых жыхароў.

Не даводзіцца сёння гаварыць у Беларусі і пра існаванне рэальных органаў мясцовага самакіравання з шырокімі магчымасцямі. Хоць відавочна, што яны вырашалі б мясцовыя задачы ў цэлым больш эфектыўна, чым гэта робяць структуры дзяржаўнай улады "здалёк". Заходнееўрапейская цывілізацыя ў гэтым пытанні развівалася менавіта так: цэнтральныя органы дзяржаўнай улады не ўмешваліся ў рашэнне "пытанняў мясцовага значэння". У дзяржавах – членах Еўрапейскага Саюза органы мясцовага самакіравання ў прынцыпе не падпарадкоўваюцца вышэйстаячым узроўням улады, за выключэннем тых сфер або пытанняў, адказнасць за якія замацавана законам за вышэйстаячымі органамі.

Да прыкладу, у Нямеччыне органы мясцовага самакіравання – гэта савет і бургамістр, якія выбіраюцца насельніцтвам. Яны вырашаюць пытанні



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ад рамонту дарог да стварэння і ўтрымання гульнёвых пляцовак для дзяцей. Таксама кожная зямля ў Германіі мае сваю канстытуцыю, і ў кожнай зямлі прымаюцца адмысловыя законы, прысвечаныя мясцоваму самакіраванню. На жаль, у адрозненне ад Заходняй Еўропы, у Беларусі мясцовае самакіраванне вельмі слабое і несамастойнае. І гэта шмат што тармозіць. Атрымліваецца, мы спачатку аддаём грошы наверх, а потым просім "дайце нам на гэтую дарогу, школу і г.д.". Пераразмеркаванне грашовых сродкаў наверх, а потым назад – гэта тупік, неэфектыўная эканамічная мадэль. Адначасова такая практыка прыводзіць да таго, што мясцовае кіраўніцтва арыентуецца ў сваёй працы не на патрэбы насельніцтва.

Дарэчы будзе нагадаць, што сярод асноўных прынцыпаў мясцовага кіравання і самакіравання (артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь") ёсць наступны прынцып: "самастойнасць і незалежнасць органаў мясцовага самакіравання ў межах сваёй кампетэнцыі ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння, недапушчэнне абмежавання паўнамоцтваў органаў мясцовага кіравання і самакіравання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі". Рэалізацыя гэтага законнага патрабавання вельмі актуальная для забеспячэння ўстойлівага развіцця вясковых тэрыторый краіны.

Навуковыя даследаванні з'яўляюцца, на наш погляд, драйверам устойлівага развіцця. Бо гэтыя дадзеныя і ацэнкі павінны падказаць і экспертам, і мясцовым жыхарам шляхі да ўстойлівасці. Тут напрошваецца аналогія з сістэмай аховы здароўя, дзе для таго, каб правільна лячыць захворванне, патрэбна добрая дыягностыка. Працягнуўшы гэтую аналогію, можна заўважыць, што самыя сучасныя падыходы лячэння хвароб канкрэтных людзей сёння звязаныя з падборам унікальных лекаў і працэдур з улікам асаблівасцяў кожнага арганізма. Кожны сельсавет – унікальны, як чалавек. У кожнага з іх – сацыяльна-прыродна-эканамічны "арганізм" мае свае асаблівасці і патрабуе свайго рэцэпту і рэкамендацый. Пры гэтым важна, каб "пацыент" сам актыўна хацеў жыць здаровым жыццём доўга і шчасліва. Немагчыма дапамагчы таму, хто ў гэтым не зацікаўлены. Таму ў рамках праекта найважнейшы акцэнт робіцца на ўдзел мясцовай супольнасці, некамерцыйных арганізацый, насельніцтва і ўлады, на развіццё іх навыкаў, абмен вопытам і практычную апрабацыю ідэй. Важны таксама міждысцыплінарны падыход да развіцця вёскі. Проста тэхнічных рашэнняў недастаткова для вырашэння комплексных праблем, і на гэта паказваюць вынікі праведзеных даследаванняў. Напрыклад, толькі абнавіўшы даільны апарат на ферме, карэнных змен не даб'ешся. Трэба адначасова павышаць прафесійную кваліфікацыю і агульны ўзровень адукацыі і куль-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

туры вясковых жыхароў, укараняць сучасныя тэхналогіі, ствараць умовы для паўнавартаснага адпачынку людзей, забяспечыць мабільнасць, доступ да Інтэрнэта і іншых інфармацыйных рэсурсаў.

Спадзяемся, што аналітычная інфармацыя і фрагменты жывой гутаркі аб магчымасцях сельскай Беларусі, якія плануецца абагульніць у спецыяльную брашуру, будуць карысныя пры выпрацоўцы рашэнняў на перспектыву на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях, з арыентацыяй на прынцыпы ўстойлівага развіцця.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова